Спорт-тайм

# «СОНЕЧНЫ ДУБЛЬ»

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» традыцыйна расказваем пра самыя прыкметныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Арына Сабаленка і бельгійка Элізэ Мёртэнс сталі пераможцамі парнага разраду турніру ў амерыканскім Маямі.*** У фінальным матчы беларуска-бельгійскі тандэм сустракаўся з аўстралійска-кітайскай парай Саманта Стосур / Чжан Шуай і выйграў у двух сэтах — 7:6 (7:5), 6:2.



Нагадаем, у сярэдзіне сакавіка Арына Сабаленка і Элізэ Мёртэнс сталі пераможцамі на турніры ў амерыканскім Індыян-Уэлсе. Яны выйгралі 10-ы матч і другі тытул запар, афоміўшы так званы Сонечны дубль. Да іх апошняй парай, якая выйграла гэтую звязку, былі швейцарка Марціна Хінгіс і індыянка Саня Мірза ў 2015-м.

Адзначым таксама, што Арына Сабаленка страціла 9-е месца ў абноўленым рэйтынгу ВТА. Апусціўшыся на 10-ю пазіцыю, яна прапусціла наверх пераможцу турніру ў Маямі Эшлі Барці з Аўстраліі.

**2.** ***Беларускія атлеты двойчы падымаліся на п'едэстал на турніры па дзюдо серыі Гран-пры, які прайшоў у Тбілісі.*** Аляксандр Вахавяк (вагавая катэгорыя — звыш 100 кг) правёў пяць схватак. У фінальным паядынку ён саступіў грузінскаму дзюдаісту Левану Мацiяшвілі і стаў уладальнікам сярэбранай узнагароды.



На трэцюю прыступку п'едэстала ўзнялася Марына Слуцкая (звыш 78 кг), якая прайграла трэцюю сутычку партугальскай спартсменцы, але ў паядынку за «бронзу» аказалася мацнейшай за французжанку Анну Фатумату М'Баіру.

У агульнакамандным заліку беларускія спартсмены спыніліся на 12-й пазіцыі. Першае месца заняла зборная Францыі, на другім радку выніковага пратакола размясціліся атлеты з Грузіі, на трэцім месцы — зборная Нідэрландаў.

**3.** ***Кацярына Галкіна заваявала дзве бронзавыя ўзнагароды на міжнародных спаборніцтвах катэгорыі Гран-пры ў французскім Цье.*** У першы дзень турніру ў індывідуальным мнагабор'і яна не змагла падняцца на п'едэстал гонару, стаўшы восьмай, а ў асобных відах Кацярыне ўдалося дабіцца больш высокіх вынікаў. Трэцяе месца яна заняла ў практыкаванні з мячом і ў практыкаванні з булавамі.

У групавых практыкаваннях зборнай Беларусі ўвайсці ў лік прызёраў не ўдалося.

**4.** ***Згуляныя першыя матчы чэмпіянату Беларусі па футболе ў элітным дывізіёне.*** Футбалісты мінскага «Дынама» абыгралі на полі ФК «Мінск» мазырскую «Славію» з лікам 1:0, дзейны чэмпіён БАТЭ перайграў магілёўскі «Дняпро» — 2:0, а сярэбраны прызёр мінулага першынства салігорскі «Шахцёр» адолеў у сябе дома мінскае «Тарпеда» — 1:0. Вынікі іншых сустрэч стартавага тура: «Мінск» — «Віцебск» — 0:0, «Гомель» — «Нёман» (Гродна) — 2:3, «Іслач» (Мінскі раён) — «Гарадзея» — 2:0, «Тарпеда-БелАЗ» — брэсцкае «Дынама» — 1:2, «Слуцк» — «Энергетык-БДУ» — 0:0.

**5.** ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова не змог прабіцца ў чвэрцьфінал Лігі чэмпіёнаў, двойчы саступіўшы нямецкаму «Фленсбургу» ў матчах 1/8 фіналу.*** Пасля дамашняга паражэння з лікам 28:30 у гасцях падапечныя Манола Кадэнаса прайгралі першы тайм з розніцай у шэсць мячоў — 8:14, а да канца сустрэчы гэтая розніца вырасла на 10 мячоў — 30:20.

Такім чынам, чэмпіёны Беларусі завяршылі выступленне ў Лізе чэмпіёнаў, а 2—3 красавіка яны прымуць у Брэсце «Фінал чатырох» SEHA-лігі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**2 КРАСАВІКА**

У краіне

**1155** год — з'явіліся першыя летапісныя звесткі пра горад Мазыр. На думку даследчыкаў, Мазыр паўстаў у VIII ст., старажытнае паселішча размяшчалася на мысе паміж ярамі правага берага Прыпяці.




**1530** год — меркаваная дата нараджэння Сымона Буднага, беларускага мысліцеля-гуманіста эпохі Адраджэння, рэфарматара, тэолага, філолага, гісторыка, паэта, філосафа, педагога. З 1558 года выкладчык і прапаведнік у пратэстанцкіх школах Вільні і Клецка. Разам з Л. Крышкоўскім і М. Кавячынскім заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ў 1562 г. выдаў на старабеларускай мове «Катэхізіс» і твор «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад богам». Належаў да ўмеранага рэлігійна-рэфармацыйнага руху, блізкага да кальвінізму. У заснаванай ім Лоскай друкарні ў 1574—1575 гадах выдаў «Новы Запавет» з прадмовай і каментарыямі, а таксама ўласнае сачыненне «Пра дзве сутнасці Хрыста», «Супраць хрышчэння дзяцей», «Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры», «Пра свецкую ўладу». У 1589 годзе ўдзельнічаў у дыспуце супраць езуітаў у Полацку, абараняючы тэзіс аб смерці душы чалавека разам з яго целам. Асуджаў аўтарытарызм і дагматызм у мысленні, інтэлектуальную нецярпімасць і рэлігійны фанатызм. Быў прыхільнікам сацыяльнай гармоніі, мірнага суіснавання ўсіх сасловў феадальнага грамадства. Памёр у 1593 годзе.

**1904** год — нарадзіўся Уладзімір Лявонцьевіч Акуліч, беларускі кінааператар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Здымаў кінахроніку, агітфільмы, сюжэты для кіначасопісаў, дакументальныя і ігравыя фільмы. Зняў мастацкія фільмы «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Палеская легенда», «Рагаты бастыён», «Чалавек не здаецца» і інш. Аператар-пастаноўшчык тэлевізійнага мастацкага фільма «Побач з вамі». Для яго творчасці характэрны рэалістычнае ўзнаўленне жыццёвых абставін, лаканізм выяўленчых сродкаў, дакладнасць партрэтных характарыстык, арганічнае ўключэнне герояў у натуральнае асяроддзе. Памёр у 1972 годзе.

**1934** год — нарадзіўся (г. Мінск) Юрый Уладзіміравіч Карпіловіч, беларускі канструктар і вучоны ў галіне вылічальнай тэхнікі, кандыдат тэхнічных навук, прафесар. У 1974—1994 гадах — галоўны інжынер Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі. Удзельнічаў у стварэнні і серыйнай вытворчасці ЭВМ тыпу «Мінск» і Адзінай сістэмы персанальных камп'ютараў і сродкаў тэлекамунікацый. Аўтар навучальных дапаможнікаў для ВНУ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Ленінскай прэміі.

У свеце

*Міжнародны дзень дзіцячай кнігі. Адзначаецца ў дзень нараджэння Ханса Крысціяна Андэрсена (1805—1875), дацкага пісьменніка-казачніка.*

**1840** год — дзень нараджэння Эміля Заля, французскага раманіста і крытыка. Адзін з самых значных прадстаўнікоў рэалізму другой паловы XIX ст., тэарэтык так званага натуралістычнага руху. Быў звязаны з найбуйнейшымі пісьменнікамі свайго часу Г. Флаберам, І. Тургеневым, А. Дадэ і інш. Аўтар цыкла «Ругон-Макары», які складаецца з 20 раманаў, аб'яднаных падзагалоўкам «Звычайная і сацыяльная гісторыя адной сям'і ў эпоху Другой імперыі». Цыкл стаў дакументальнай справаздачай аб французскім жыцці з часоў узыходжання на трон Напалеона III да паражэння Францыі ў бітве пры Седане (1870). Памёр у 1902 годзе.

**1991** год — у Мадрыдзе на сустрэчы парламентарыяў краін — удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе было прынята рашэнне аб стварэнні Парламенцкай асамблеі НБСЕ (цяпер АБСЕ).

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.41 | 19.47 | 13.06 |
| Віцебск — | 6.29 | 19.38 | 13.09 |
| Магілёў — | 6.31 | 19.37 | 13.06 |
| Гомель — | 6.29 | 19.32 | 13.03 |
| Гродна — | 6.56 | 20.01 | 13.05 |
| Брэст — | 6.59 | 20.00 | 13.01 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 28 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандры, Клаўдзіі, Матроны, Праскоўі, Ульяны, Фядосы, Віктара, Івана, Мікіты, Севасцьяна, Сяргея.*
***К.*** *Мальвіны, Марыі, Уладзіслава, Францішка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Як выхадныя?
— Светла, цёмна, светла, цёмна, панядзелак.

**Няшчасны выпадак здарыўся на фестывалі піва: у гараж наведалася жонка.**

— Слухай, няўжо яшчэ існуюць людзі, якія на вуліцы ў бабуль марынаваныя грыбы купляюць?
— Ужо не існуюць.

**Зіма скончылася, і кітайцы ўжо наладзілі для нас вытворчасць вясновалетніх пухавікоў.**

— Нешта паесці захацелася.
— У чатыры гадзіны раніцы?!
— Галоўнае — не пасля шасці...

**Новая прымаўка даішнікаў.**
**Адзін злоўлены п'яным лепш, чым курачка па зярнятку.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1252.
Нумар падпісаны ў 19.30 1 красавіка 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12